Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-01-29

# На тым тыдні...

✓ **19 студзеня ў КЗ «Мінск» фальклор-тэатр «Госьціца»** прэзентаваў свой другі **альбом – «...І куды што падзелася?»**. Гэта рарытэтны збор запісаў спеўнага рэпертуару ўдзельнікаў гурта 1986 – 2005 гг. На канцэрце-сустрэчы можна было пачуць лепшыя спеўныя шэдэўры з калекцыі «Госьціцы», сольныя выступленні, убачыць фрагменты з відэафільмаў і канцэртных праграмаў фальклор-тэатра ды інш.



✓ 20 студзеня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася **прэзентацыя каталога «Афішы да спектакля "Паўлінка" па аднайменнай п'есе Янкі Купалы»**. Гэты каталог стаў першай спробай прадставіць у адным выданні захаваныя ў фондах музея афішы, створаныя на працягу 1913 – 2013 гг.

Выданне адлюстроўвае цесную сувязь паміж жыццём і творчасцю Янкі Купалы і стварэннем ды развіццём аднаго з вядучых беларускіх тэатральных калектываў – Першага беларускага дзяржаўнага тэатра (сёння – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), які сёлета адзначае 95-годдзе з дня адкрыцця. На яго сцэне «Паўлінка» жыве ўжо больш за семдзесят гадоў.

Інфармацыя, размешчаная ў каталогу, з'яўляецца каштоўным гісторыка-культурным матэрыялам, які адлюстроўвае сцэнічны лёс п'есы Янкі Купалы, гісторыю яе ўвасаблення на сцэне прафесійных і аматарскіх тэатраў у Беларусі і па-за яе межамі. Разам з афішамі ў выданні пададзеныя ўспаміны, фатаграфіі, дакументальныя матэрыялы.

✓ 21 студзеня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася **выстаўка жывапісу «Залаты век»**, прымеркаваная да 10-годдзя аб'яднання мастакоў «Арцель». Галоўная эстэтычная ідэя, што ляжыць у аснове іх творчасці, – адраджэнне ідэалаў Срэбнага веку, страчаных у XX ст. Выстаўка з'яўляецца працягам серыі праектаў «Тэрыторыя любові» (2007), «Час любові» (2013), «Крыніца святла» (2014).

✓ 22 студзеня Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі зладзілі сумеснае **мерапрыемства «Сваёй дарогай запаветнай...»**, прымеркаванае да 95-годдзя з дня нараджэння Міколы Аўрамчыка – паэта, празаіка, перакладчыка, заслужанага работніка культуры Беларусі.

*Падрабязней чытайце на стар. 2.*

✓ 22 студзеня ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску адкрылася **выстаўка твораў Канстанціна Шаранговіча**. Брат мастака Васіля Шаранговіча, ён цягам амаль трыццаці гадоў быў выкладчыкам Беларускай акадэміі мастацтваў, ствараў працы ў жанрах кніжнай, станковай графікі і жывапісу.

